**ДУК Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за верасень 2025 г.

## Мерапрыемствы да Дня беларускага пісьменства

**3.09.2025г.**

У чытальнай зале Установы, пры ўдзеле члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталлі Кандрашук, адбылося літаратурнае падарожжа «Волаты беларускага кнігадрукавання», прымеркаванае да Дня беларускага пісьменства. Пасля мерапрыемства госці змаглі пазнаёміцца з кнігамі, прадстаўленымі на тэматычнай выставе «Свята слова, свята кнігі». Мерапрыемства суправаджалася музычнымі нумарамі ў выкананні бібліятэчнага вакальнага гурта «Фантазія».

ЦРБ

**8.09.2025г.**

Супрацоўнікі Кобрынскай раённай цэнтральнай бібліятэкі правялі чэлендж да Дня народнага адзінства па вершам Алеся Ставера.

ЦРБ

**16.09.2025г**

У чытальнай зале ЦРБ у рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі», прйшоў гістарычны экскурс «Гісторыя беларускай кніжнасці» для выхаванцаў Кобрынскай дзіцячай вёскі. Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Славутыя імены Беларусі».

ЦРБ

## Мерапрыемствы да Дня народнага адзінства

Да Дня беларускага пісменства супрацоўнікі ЦРБ правялі чэлендж па вершам Міхася Пазнякова.

ЦРБ

**17.09.2025г.**

Літаратурна-музычная гадзіна «Моц Беларусі — у адзінстве народа» прайшла у чытальнай зале ЦРБ. На мерапрыемства запрошаны падапечныя аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН і пражываючыя ў сацыяльным пансіянаце «Нікольскі».

ЦРБ

**17.09.2025г.**

Час яднання «Мы – людзі адзінай цудоўнай зямлі – Беларусь» прайшоў у чытальнай зале ЦРБ. Гасцямі мерапрыемства сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа. Вядучыя пазнаёмілі прысутных з

падзеяй 1939 года, якая стала адной з самых знамянальных у гісторыі нашай краіны – уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

ЦРБ

**Мерапрыемствы ў рамках раённага рэкламнага тыдня «Сделаем вместе досуг полезным и интересным!»**

З 09. 09. 2025 па 14. 09. 2025 у бібліятэках ДУК прайшоў рэкламны тыдзень «Сделаем вместе досуг полезным и интересным!», у рамках якога прайшлі мерапрыемствы: літаратурнае рандэву «С новой книгой назначена встреча», фатасушка «Пойманы за чтением», маніторынг чытацкіх пераваг «Голосуй ЗА книгу!», акцыя «В одном кадре с книгой».

**9.09.2025г.**

У ЦРБ прайшоў дзень адчыненых дзвярэй «Очаг культуры негасимый, или один день из жизни библиотеки».

ЦРБ

**10.09.2025г.**

ЦРБ правяла дзень чытацкіх задавальненняў «А у нас для Вас сюрприз» і акцыю «Подари книгу библиотеке».

ЦРБ

**11.09.2025г.**

У ЦРБ прайшоў кніжны чэлендж «Прямые эфиры в Инстаграмм» і відэапрэзентацыя «Живое интервью».

ЦРБ

**12.09.2025г.**

У ЦРБ прайшоў лібмоб «Книга, чтение, библиотека».

ЦРБ

**12.09.2025г.**

У рамках раёнага тыдня бібліятэчнай рэкламы у філіяле «Дзіцячая бібліятэка» прайшла літаратурна-гульнявая праграма «ПервоКЛАССный день». Займальнай для дашкольнікаў стала віктарына «По страницам любимых сказок». Цікавым дадаткам праграмы стаў мультфільм «Три кота в библиотеке».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка»

**13.09.2025г.**

У філіяле «Дзіцячая бібліятэка» прайшоў дзень самакіравання пад назвай «БИБЛИОДУБЛЁР». Юныя чытачы змаглі адчуць сябе сапраўднымі бібліятэкарамі.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка»

**Іншыя мерапрыемствы**

**1.09.2025г.**

Для навучэнцаў старэйшых класаў СШ № 5 г.Кобрына і СШ № 8 г. Кобрына ў чытальнай зале Кобрынскай РЦБС праведзены адзіны першы ўрок пад назвай «Эстафета поколений: сохраняя прошлое, создаём будущее».

ЦРБ

**5.09.2025г.**

У чытальнай зале ЦРБ адбылася сустрэча з кіраўніком Сакратарыята Кобрынскага аддзялення Беларускай партыі «Белая Русь» Андрашчуком Алегам Пятровічам.

ЦРБ

**8.09.2025г.**

У рамках сумеснага праекта ПЦПІ Кобрынскай РЦБС і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Библиотека и нотариат: взаимовыгодное сотрудничество» у чытальнай зале ЦРБ праведзена індывідуальнае кансультаванне грамадзян па натарыяльных пытаннях, а таксама адбылася сустрэча натарыуса з падапечнымі ТЦСАН, якія пражываюць у сацыяльным пансіянаце «Нікольскі».

ЦРБ

**15.09.2025г.**

Філіял «Залеская сельская бібліятэка» запрасіў жыхароў і гасцей вёскі на традыцыйную вераснёўскую сустрэчу ў літаратурна-музычнай гасцёўні «Душа о вечности поёт». Сустрэча аб'яднала людзей розных пакаленняў: навучэнцаў старэйшых класаў, выкладчыкаў, людзей сярэдняга і сталага ўзросту. У абмеркаванні тэмы прынялі ўдзел прадстаўнікі адміністрацыі Залескай школы, Залескага сельвыканкама, святары Петрапаўлаўскага храма г.Кобрына, а таксама член Саюза кінематаграфістаў Беларусі, рэжысёр, сцэнарыст І. А. Кобзеў.

Філіял «Залеская сельская бібліятэка»

**15.09.2025г.**

У рамках бібліятэчнага праекта «От милосердия в книгах – к неравнодушию к жизни» у філіяле «Дзівінская сельская бібліятэка» прайшоў бенефіс бібліятэкі «Библиотека – волшебное место, где книгам не скучно, где всем интересно».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»

**26.09.2025г.**

У чытальнай зале ЦРБ прайшла музычна-гістарычная кампазіцыя «Как хорошо под мирным небом жить!», прымеркаваная да Міжнароднага дня міру. Вядучыя расказалі пра традыцыі і сімвалы важнага для ўсіх людзей свята. Прысутныя чыталі вершы пра мір, сяброўства, узаемаразуменні і павазе адзін да аднаго. Музычныя нумары падрыхтаваў бібліятэчны вакальны гурт «Фантазія».

ЦРБ

Выканаўца
Чопік Д. І.
3 85 81